Также в юридической литературе выделяют два обязательных признака обмана, которые должны присутствовать в совокупности:

1) наличие кроме «деятеля» (обманщика) «объекта» воздействия (лицо, которое обмануто либо предполагалось обмануть);
2) обман связан всегда с намеренностью, заведомостью и умыслом.

Наш УК не содержит легального определения «обмана». Не разъяснен данный термин и в постановлении Пленума Верховного Суда Республики Беларусь от 21 декабря 2001 г. № 15 «О применении судами уголовного законодательства по делам о хищениях имущества». В свою очередь, российский законодатель определил термин «обман» в абз. 1 п. 2 Постановления Пленума Верховного Суда РФ от 30.11.2017 № 48 (ред. от 29.06.2021) «О судебной практике по делам о мошенничестве, присвоении и растрате». Законодательное определение «обмана» было ранее дано в УК РФСФР 1922 г. в примечании к ст. 187 – обманом считается как сообщение ложных сведений, так и заведомое сокрытие обстоятельств, сообщение о которых было обязательно. Данное толкование «обмана» в УК РФСФР было теоретически полным, так как включала в себя и активную, и пассивную форму обмана.

В свою очередь, Г. Н. Борзенков считает, что данное определение следует уточнить: активная форма обмана предполагает не только словесную форму обмана, но и различные действия. Например, внушение потерпевшему недействительной информации мошенником – это искажение истины. В связи с этим формулировку «сообщение ложных сведений» заменить на «искажение истины». А в пассивной форме вместо «сокрытие обстоятельств» использовать «умолчание об истине», так как сокрытие имеет 2 формы (активную и пассивную). Подобное краткое определение, которое раскрывает объективную (внешнюю) сторону обмана было дано Г. А. Мендельсоном: «обманом называется всякое искажение истины или умолчание об истине».

В связи с вышесказанным, считаю необходимым, чтобы наш законодатель добавил легальное определение «обмана» в ст. 4 УК. Например, обман – это заведомое искажение истины или умолчание об истине.

***Жураў М. С.***

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ УЛАСНАСЦІ І ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: ПЫТАННІ ВЫЗВАЛЕННЯ АД КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

*Жураў Мікіта Сяргеевіч, студэнт 3 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, mikitazhurau@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік: канд. юрыд. навук, дацэнт Шыдлоўскі А. В.*

Нягледзячы на тое, што арт. 3 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь замацоўвае прынцып непазбежнасці адказнасці, а крымінальная адказнасць мае ў якасці мэт “выпраўленне асобы, якая здзейсніла злачынства”, “садзейнічанне аднаўленню сацыяльнай справядлівасці” (арт. 44), крымінальны закон утрымлівае шэраг выключэнняў з названых

асноваўтвараючых палажэнняў. Акрамя агульных падстаў вызвалення ад крымінальнай адказнасці, якія могуць ужывацца ў дачыненні да асобы, якая здзейсніла грамадска небяспечнае дзеянне, што ўваходзіць у вызначаную законам катэгорыю, выдзяляюць асобную групу падстаў.

Выдзяленне гэтай групы падстаў абумоўлена наступнымі спецыфічнымі іх рысамі:

1) яны вызваляюць ад уздзеяння мер крымінальнай адказнасці асобу, якая замахваецца на пэўны аб'ект (грамадскія адносіны), у той час як агульныя падставы арыентаваны на выкананне патрабаванняў, што не ставяцца ў залежнасць ад аб'екта грамадска небяспечнага дзеяння;

2) яны распаўсюджваюцца выключна на названыя ў іх злачынствы, закранаючы толькі адзінкавыя склады злачынстваў у параўнанні з агульнымі падставамі;

3) залежнасць спецыяльных падстаў ад непасрэднага аб'екта злачынства, ад канкрэтнага злачынства ў цэлым абумоўлівае ўнікальныя, асобна ўзятыя патрабаванні да абвінавачанага: гэта, напрыклад, пакрыццё шкоды, яўка з пакаяннем і інш.

Лічым у дадзеным кантэксце мэтазгодным прааналізаваць з улікам азначаных крытэрыяў спецыяльныя падставы вызвалення ад адказнасці асоб, якія здзейснілі злачынствы, прадугледжаныя раздзелам IX Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Радавы аб'ект гэтых дзеянняў складаюць дзве групы адносін – грамадскія адносіны ўласнасці, а таксама грамадскія адносіны, якія ўзнікаюць у мэтах ажыццяўлення нармальнай эканамічнай дзейнасці па вытворчасці, размеркаванні, абмене і спажыванні матэрыяльных даброт і паслуг. Менавіта яскрава выражаны маёмасны характар аб'екта злачынстваў знайшоў адлюстраванне ва ўмовах вызвалення ад адказнасці, прадугледжаных у гэтых артыкулах. Заканадаўца заклаў у іх, як след, кампенсацыйныя меры, што закранаюць матэрыяльны элемент (звязаныя з пакрыццём шкоды, вяртаннем аб'екта злачынства): так, ад адказнасці за кантрабанду (арт. 228) вызваляецца асоба, якая добраахвотна здала наяўныя грашовыя сродкі і (або) грашовыя інструменты, указаныя ў артыкуле; у адпаведнасці з п. 6 Заўваг да главы 24 кодэкса асоба, якая здзейсніла адно з пералічаных у ім злачынстваў, вызваляецца ад адказнасці ў тым ліку пры поўным пакрыцці прычыненай шкоды. Трэба заўважыць, што матэрыяльны характар умоў па спецыяльных падставах вызвалення ўласцівы перш за ўсё злачынствам супраць уласнасці, чым злачынствам супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці. Для апошніх больш характэрна выкарыстанне іншых па характары патрабаванняў: дабравольнае паведамленне аб здзейсненым, актыўнае садзейнічанне раскрыццю і (або) расследаванню злачынства (арт. 235, 252, 253), што можна патлумачыць другаснасцю, апасродкаванасцю прычынення маёмаснай шкоды такімі злачынствамі, немагчымасцю яе падліку, ацэнкі. У сваю чаргу, Крымінальны кодэкс дапускае магчымасць вызвалення ад адказнасці па спецыяльных

падставах у выпадку ўчынення злачынства па адным з дзесяці артыкулаў, прычым шэсць з іх змешчаны ў гл. 24.

З гэтага вынікае, што злачынныя дзеянні, накіраваныя супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, разглядаюцца заканадаўцам як тыя, што цягнуць больш схаваную грамадскую небяспеку ў параўнанні са злачынствамі супраць уласнасці з прычыны высокай латэнтнасці такіх злачынстваў (камерцыйны шпіянаж, незаконнае атрыманне крэдыту або субсідыі, маніпуляванне рынкам каштоўных папер і г. д.). Зыходзячы з гэтага, разглядаем слушным вылучэнне прапановы аб замацаванні дадатковай умовы для вызвалення ад адказнасці асоб, якія здзейснілі злачынства па частцы 1 артыкулаў 205, 209–212, 214 – выплата кампенсацыі пацярпеламу ў памеры 100 працэнтаў ад сумы прычыненай шкоды.

З адзначанага вышэй можна зрабіць наступныя вывады. Спецыяльныя падставы вызвалення ад адказнасці, прадугледжаныя ў артыкулах раздзела IX, маюць сваю спецыфіку, абумоўленую характарыстыкамі радавога аб’екта злачынстваў – грамадскія адносіны ўласнасці і грамадскія адносіны ў сферы ажыццяўленні нармальнай эканамічнай дзейнасці, рэалізацыі этапаў эканамічнага цыкла. Варта дадаць, што і радавы, і відавы аб’екты з’яўляюцца фактарамі, што ўплываюць на вызначэнне ўмоў вызвалення ад адказнасці і на магчымасць вызвалення па асобных складах у цэлым. У дадзеным кантэксце лічым мэтазгодным узмацніць патрабаванні да асоб, якія прэтэндуюць на вызваленне ад адказнасці па злачынствах супраць уласнасці, і дадаць у іх лік абавязак выплаты кампенсацыі асобе, якой была прычынена шкода, у памеры 100 працэнтаў ад сумы гэтай шкоды.

***Землянко О. А., Мельникова Ю. И.***

## ПРОБЛЕМНЫЕ АСПЕКТЫ КВАЛИФИКАЦИИ ДЕЯНИЙ ПО СТАТЬЕ О ДОБРОВОЛЬНОЙ СДАЧЕ В ПЛЕН

*Землянко Ольга Александровна, Мельникова Юлия Ивановна, студентки 5 курса Института прокуратуры Саратовской государственной юридической академии, Саратов, Россия, zzemlyanko@yandex.ru, ulia.melnikova19@outlook.com*

*Научный руководитель: канд. юрид. наук, доцент Проводина Е. В.*

24 сентября 2022 г. Президентом Российской Федерации был подписан Федеральный закон № 365-ФЗ «О внесении изменений в Уголовный кодекс Российской Федерации и статью 151 Уголовно-процессуального кодекса Российской Федерации». В Уголовный кодекс Российской Федерации (УК РФ) им была введена ст. 352.1 «О добровольной сдаче в плен». Особо актуальным в настоящее время представляется вопрос, касающийся квалификации и расследования преступлений, совершенных военнослужащими в условиях вооруженного конфликта. Одним из таких является добровольная сдача в плен.

Безусловно, такое стремительное внесение изменений в УК РФ было продиктовано сложной социально-политической обстановкой, сложившейся